Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРА-МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут. Тэл. 21877 і 23280.

№ 9 (122) | 21—31 сакавіка | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

ПАСТАНОВА № 59/167

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў СССР.

Пра організацыю Цэнтральнага Кіраўніцтва Адзінай Гідро-мэтэоролёгічнай Службы СССР пры Народным Камісарыяце Земляробства СССР (агалошана ў Зборы Законаў і распараджэньняў Раб.-Сял. Ураду СССР ад 10/III-1933 г. № 14, аддз. 1, арт. 82).

У мэтах палепшаньня Гідро-мэтэоролёгічнай службы, якая мае вялікае значэньне для народнай гаспадаркі, культурнага будаўніцтва і абароны краіны Саюза ССР—Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

1.Ператварыць Гідро-мэтэоролёгічны Камітэт Саюза ССР і РСФСР пры Народным Камісарыяце Земляробства Саюза ССР

у Цэнтральнае Кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР, якое састаіць пры Народным Камісарыяце Земляробства Саюза ССР.

2. Гідра-мэтэоролёгічныя Камітэты пры Народных Камісарыятах Земляробства саюзных і аўтаномных рэспублік, пры краявых і вабласных зямельных кіраўніцтвах ператварыць у кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР пры адпаведных Народных Камісарыятах Земляробства, краявых і вабласных зямельных кіраўніцтвах.

Пры Народным Камісарыяце Земляробства РСФСР Кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР не ўтвараецца.

Сярэдня-Азіяцкі Гідра-мэтэоролёгічны Камітэт ператварыць у Сярэдня-Азіяцкае Кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы пры Сяр.-Аз. Экаса.

Усе краявыя і вабласныя кіраўніцтвы Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы на тэрыторыі РСФСР, рэспубліканскія кіраўніцтвы іншых саюзных рэспублік і Сяр.-Азіяцкае Кіраўніцтва непасрэдна падпарадкоўваюцца Цэнтральнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР.

3. Захаваньне ў іншых ведамствах і організацыях Гідрамэтэоролёгічных устаноў, станцый і пастоў дапускаецца; апроч выпадкаў, якія прадугледжаны спэцыяльнымі законамі, толькі пры немагчымасьці для Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай службы задаволіць патрэбы гэтых ведамстваў і організацый і ня інакш, як па ўзгадненьні з Цэнтральным Кіраўніцтвам Адзінай Гідрамэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР.

4. Для агульнага накіраваньня дзейнасьці Адзінай Гідрамэтэоролёгічнай службы Саюза ССР у адпаведнасьці з патрэбамі і запросамі розных галін народнай гаспадаркі, культурнага будаўніцтва і абароны краіны, утварыць пры Цэнтральным Кіраўніцтве Адзінай Гідра-Мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР Савет з удзелам прадстаўнікоў зацікаўленых ведамстваў.

5. Выдаткі па ўтрыманьню Цэнтральнага Кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР, а таксама ўсіх яго агульна-саюзных, рэспубліканскіх і мясцовых органаў адносяцца на агульна-саюзны бюджэт па самастойным каштарысе.

Прадугледжаныя па рэспубліканскіх і мяйсцовых бюджэтах на 1933 г. сродкі на фінансаваньне органаў Адзінай Гідрамэтэоролёгічнай Службы павінны быць перададзены Цэнтральнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідра-Мэтэоролёгічнай Службы.

6. Даручыць Савету Народных Камісараў Саюза ССР:

а) Зацьвердзіць палажэньне аб Цэнтральным Кіраўніцтве Адзінай Гідра-Мэтэоролёгічнай Службы Саюза ССР і яго органах.

б) Унесьці ў дзейнічаючае законадаўства Саюза ССР зьмены, якія выцякаюць з гэтае пастановы.

7. Даручыць урадам Саюзных рэспублік у месячны тэрмін прывесьці законадаўства рэспублік у адпаведнасьці з гэтай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага
Выканаўчага Камітэту Саюза ССР **М. Калінін.**

Нам. Старшыні Савету Народных
Камісараў Саюза ССР **В. Куйбышаў.**

Сакратар Цэнтральнага
Выканаўчага Камітэту Саюза ССР **Е. Енукідзе.**

Масква, Крэмль.
23 лютага 1933 г.

ПАСТАНОВА № 355

Савету Народных Камісараў БССР.

28 сакавіка 1933 г. *г. Менск.*

Пра організацыю Галоўнага Кіраўніцтва адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы пры Народным Камісарыяце Земляробства БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства неадкладна рэорганізаваць Гідрамэтэоролёгічны Камітэт БССР у Галоўнае кіраўніцтва Адзінай Гідра-мэтэоролёгічнай Службы паводле пастановы ЦВК і СНК СССР ад 23 лютага 1933 г. „Пра організацыю Цэнтральнага кіраўніцтва Адзінай Гідромэтэоролёгічнай Службы Саюзу ССР пры Народным Камісарыяце Земляробства Саюзу ССР“ (З. З. СССР 1933 г., № 14, арт. 82).

2. Скасаваць палажэньне пра Гідра-мэтэоролёгічны Камітэт з усімі зьменамі яго (З. З. БССР 1930 г., № 18 паст. 120, № 37 паст. 250, 1931 г. № 9, паст. 80, № 36 паст. 230).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў
і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

Сыноптычны агляд

Другая дэкада сакавіка была характэрна прарывам цёплага паветра праз Эўропу на тэрыторыю Саюзу.

Гэтым патокам цёплага паветра, якім зьліквідаваны сьнегавы насьціл у басэйне Заходняй Дзьвіны, Дняпра, Дона, і пачалася вясна ў БССР.

Цыклёнічная дзейнасьць, якая утваралася на фронтальным падзеле паміж гэтым цёплым морскім полярным і контынэнтальным полярным паветрам з аднаго боку, і халодным арктычным паветрам з другога,—зьмяшчалася к усходу разам з агульным

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных на

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %
			21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Чысло, калі нага. мін.	
(Вазёрны)	2	Дрыса	3	−2	−3	−1	1	3	0	0	2	6	9	0	—	16	−8	24	73
	3	Полацак	3	−1	−2	−1	2	3	0	0	2	6	9	3	0	14	−4	23	65
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	1	−2	−4	−3	0	2	−2	−1	1	4	8	0	−1	13	−7	24	72
(Вадападзельны)	8	Лепель	—	−3	−2	−2	2	3	−1	0	2	5	10	1	—	14	—	—	79
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	3	−2	−2	−1	2	5	0	0	2	6	8	2	1	14	−5	24	70
	16	Менск	3	−2	−1	−1	2	5	0	2	2	6	8	2	0	15	−4	24	62
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	4	−3	−3	2	1	3	1	1	2	5	8	2	0	14	—	—	74
	25	Асіпавічы	3	−2	−2	−2	−1	4	0	1	3	6	10	2	1	16	−6	24	59
	10	Ворша	2	−2	−3	−2	0	4	0	0	1	5	8	1	0	13	−6	24	70
	19	Горкі	1	−2	−3	−3	0	2	−1	0	1	4	8	1	−1	13	−7	24	67
(Раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	4	2	−1	−1	1	4	1	2	3	6	8	3	—	12	—	—	70
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны	4	−1	−2	−2	0	3	1	2	3	6	9	2	2	14	−5	24	—
	21	Магілеў	2	−2	−3	−5	1	4	0	0	1	5	9	1	0	14	−6	24	73
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	1	0	−2	−1	1	3	0	0	1	5	7	1	0	13	−4	24	55
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	2	−1	−2	−1	1	4	1	1	2	3	7	2	1	13	−4	24	62
	32	Жлобін	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
(Нізіны)	33	Жыткавічы	1	−2	−1	−2	0	3	1	2	4	6	10	3	2	15	−5	24	63
	37	Калінкавічы	3	−1	−1	−1	0	4	1	2	3	6	10	2	2	15	−4	25	86
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	1	2	−1	−1	1	6	2	1	2	6	8	2	—	12	−4	25	—
	38	Гомель	2	1	−1	−1	1	5	2	1	2	6	8	3	1	14	−4	25	75
	35	Васілевічы	3	0	−1	−1	1	5	1	2	3	6	10	2	1	15	−3	25	62
	40	Людвінава	2	2	0	0	1	4	3	2	7	5	8	3	2	14	−4	28	71
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

...ых назіраньняў за 21—31 сакавіка 1933 г.

...Чысло, калі на гл. мін.	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпэратура паверхні глебы: Максым.	Тэмпэратура паверхні глебы: Мінімальн.	Тэмпэратура паверхні глебы: Чысло, калі на гл. мін.	Ападкі ў мм: 21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сума	Мэтэоролёгічная зьява (у дужках адзначаны чыслы)
24	73	—	—	—	2.0	0.3	..	..	..	..	..	2.0	..	..	..	4.3	—
23	65	—	—	—	3.0	..	..	..	..	..	..	5.0	..	..	0.3	8.3	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	3.0	5.0	..	..	..	..	..	5.0	..	..	..	13.0	—
24	72	14	—12	28	3.0	1.0	..	..	..	..	..	5.0	..	..	..	9.0	—
—	79	—	—	—	1.0	1.0	..	..	..	..	..	..	2.0	..	..	4.0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	1.0	..	..	..	..	..	..	3.0	..	..	..	4.0	—
—	—	—	—	—	0.1	1.0	2.0	..	..	0.1	..	7.0	0.3	0.2	..	10.7	—
24	70	—	—	—	3.0	1.0	..	..	..	..	..	4.0	0.2	..	..	8.2	туман (29)
24	62	14	—5	24	1.0	..	..	..	..	0.1	..	2.0	0.2	..	0.1	3.4	туман (21, 28)
—	—	—	—	—	3.0	..	..	..	..	..	..	..	..	..	0.1	3.1	—
—	74	—	—	—	1.0	..	..	..	..	..	1.0	1.0	..	..	..	3.0	туман (25, 29)
24	59	—	—	—	3.0	6.0	..	..	..	..	..	..	4.0	2.0	..	15.0	туман (21, 22, 29)
24	70	—	—8	24	2.0	3.0	..	..	..	..	..	4.0	0.4	..	..	9.4	—
24	67	24	—9	24	2.0	4.0	..	..	..	..	...	3.0	1.0	..	..	10.0	бура (23), туман (22)
—	—	—	—	—	4.0	2.0	..	..	..	..	..	6.0	0.3	..	3.0	15.3	—
—	70	—	—5	24	2.0	2.0	..	..	..	..	..	2.0	..	..	0.1	6.1	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
24	—	—	—	—	1.0	..	..	..	..	..	..	1.0	0.2	..	0.3	2.5	туман (21)
24	73	—	—	—	5.0	4.0	..	..	..	..	..	..	..	2.0	0.1	11.1	туман (21, 24)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
24	55	—	—	—	2.0	2.0	1.0	..	..	..	..	5.0	1.0	..	1.0	12.0	туман (23)
—	—	—	—	—	1.0	0.1	2.0	..	..	..	..	5.0	0.1	0.1	3.0	11.3	—
24	62	20	—	—	0.4	2.0	..	..	..	..	..	5.0	..	..	..	7.4	туман (21)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
24	63	—	—	—	5.0	4.0	..	..	..	..	0.1	0.6	1.0	..	3.0	13.7	—
25	86	—	—	—	2.0	0.4	..	..	..	..	..	3.0	1.0	..	0.1	6.5	туман (21)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	2.0	0.2	5.0	..	..	..	..	..	1.0	..	..	8.2	туман (21, 22)
25	—	16	—	—	..	..	..	1.0	..	..	..	..	8.0	..	..	9.0	—
25	75	—	—	—	1.0	0.2	..	..	..	..	..	5.0	0.2	..	0.2	6.6	туман (21, 22)
25	62	—	—	—	0.2	0.1	0.1	..	..	..	..	3.0	3.0	..	0.1	6.5	туман (30, 31)
28	71	19	—4	28	0.5	0.2	..	0.1	0.1	..	..	3.0	2.0	..	0.5	6.4	туман (21, 22)
—	—	—	—	—	0.5	0.4	..	..	..	..	..	2.0	2.0	..	..	4.9	—

…бліца вынікаў мэтэоролёгіч. назіраньняў за 21—31 сакавіка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасьць	Вецер: З максым. хуткасьцю — Напрамак	Вецер: З максым. хуткасьцю — Хуткасьць	Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхнёвага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
(Вазёрны)	2	Дрыса	SW	4	SW	6	—	8	5	мокрая
	3	Полацак	W	4	W	6	—	5	5	мокрая
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	7	Нова-Каралёва	W	4	SE	12	31	8	5	„
(Вадападзельны)	8	Лепель	NE	4	NW	6	—	—	—	мокрая
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	13	Барысаў	SW	4	NE	12	—	8	5	вільготная
	16	Менск	NE	4	NE	9	—	5	5	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	23	Мар'іна-Горка	NE	6	N	17	—	8	5	мокрая
	25	Асіпавічы	N	4	NW	6	—	8	5	„
	10	Ворша	NE	4	NE	6	—	8	5	„
	19	Горкі	SW	4	NE	17	—	8	5	„
(Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	28	Слуцак	N	4	NE	9	—	5	4	„
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	E	17	—	5	5	мокрая
	21	Магілеў	N	6	N	17	—	8	5	„
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	NE	4	NE	9	—	8	5	мокрая
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	„
	31	Турск	NE	4	NE	6	—	8	7	„
	32	Жлобін	—	—	—	—	—	—	—	—
(Нізінны)	33	Жыткавічы	W	4	SW	6	—	8	5	мокрая
	37	Калінкавічы	NE	4	NE	14	—	8	5	вільготная
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	N	—	NE	14	—	5	5	„
	38	Гомель	NE	4	NE	12	—	8	7	мокрая
	35	Васілевічы	NW	—	NE	9	—	8	7	„
	40	Людвіна	W	4	W	9	—	7	6	„
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

рухам цёплага паветра на ўсходзе. У тыл яму пачало ўваходзіць арктычнае паветра з боку Грэнляндыі ў той час, калі цыклёнічная дзейнасьць знаходзілася ў раёне Ісьляндыі—Скандынавіі. Па меры агульнага зьмяшчэньня цыклёнічнай вобласьці к усходу, арктычнае паветра паступова займае Ісьляндыю, а потым Скандынавію, адкуль яно распаўсюджваецца на Заходнюю Эўропу і Эўропейскую тэрыторыю Саюзу.

Гэтым арктычным паветрам і выклікана пахаладаньне 21—29 сакавіка.

Малюнак атмосфэрнай дзейнасьці 21-га сакавіка быў наступны: контынэнтальнае полярнае паветра займае Эўропейскую тэрыторыю Саюзу і ўтварае надвор'е з адлігамі.

Ангельшчыну, Францыю і поўдзень Цэнтральнай Эўропы займае марское полярнае паветра з тэмпэратурамі, якія дасягаюць да 6—10^0.

Праз Скандынавію адбываецца інтэнсыўны рух халоднага арктычнага паветра на Цэнтральную Эўропу і Эўропейскую тэрыторыю Саюзу.

На падзеле паміж гэтым арктычным паветрам і контынэнтальным полярным наглядаецца цыклёнагенэз, які працягваецца ад Польшчы,—на азёры і далей на Белае і Барэнцава моры. Гэтая цыклёнічная дзейнасьць арктычнага фронту зьмяшчаецца на паўночны-ўсход нашага Саюзу.

У гэты-ж час на Чорным моры і прылягаючай да яго тэрыторыі адбываецца цыклёнічная дзейнасьць на полярным фронце.

У прышоўшым у пачатку дэкады з поўначы арктычным паветры на тэрыторыі Цэнтральнай Эўропы і прылягаючых да яго паўночна-заходніх і заходніх частках нашага Саюзу разьвіваецца антыцыклёгенэз, у якім адбываецца трансформацыя арктычнага паветра ў контынэнтальнае полярнае і ўтвараецца вобласьць высокага ціску.

Гэткае разьмеркаваньне барычных вобласьцяй — максымум у цэнтральнай частцы Саюзу і мінімум на Чорным моры спрыяе ўтварэньню вялікага барычнага градыенту, які абумовіў моцныя вятры ў БССР у першых лічбах апошняй дэкады сакавіка, а процэс антыцыклёгенэза абумовіў у тых-жа раёнах утварэньне сухога, сонечнага надвор'я.

Па меры прасоўваньня ядра былога арктычнага паветра к поўдню БССР пападае ў цэнтральную частку антыцыклёнагенэза, дзякуючы чаму 24-га, 26-га сакавіка наглядаецца паслабленьне вятроў пры параўнальна вялікім сутачным ваганьні тэмпэратуры ад марозаў, якія дасягаюць раніцай ад —4 да —5^0, і цяпла днём, якое дасягае 5—8^0.

У гэтыя дні к захаду ад Эўропы ў Атлянтычным акіяне аднаўляецца паўднёва-заходняя цяга цёплага паветра, якое было парушана прарывам арктычнага паветра з поўначы.

Цыклёнічная дзейнасьць ізноў разьвіваецца ў раёнах Ісьляндыі, Шпіцбергена, адкуль яна зьмяшчаецца на Барэнцава мора і далей на нізавіны рэк Вобі і Енісея.

Дзякуючы гэтакаму высокаму паўночнаму разьмеркаваньню цыклёнічнай дзейнасьці аднаўляецца заходняя цяга на Эўро-

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра: Сярэдняя	Адхіленьне ад нормы	Максымальная	Дата	Мінімальная	Дата	Адносная вільготн. у %%: Сярэдняя	Мінімальная	Тэмпэратура на паверхні глебы: Мінімальная	Дата	Лік дзён з тэмпэратур. глебы ≤ 0°
I. Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	—6.7	—	30	13	—20.3	18	90	70	—	—	—
	3	Полацак	—6.6	+0.2	2.4	3	—21.7	21	85	55	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	—7.9	—0.4	0.8	13	—22.2	21	85	60	—25.0	21	28
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	—5.8	+0.3	2.6	11	—18.8	28	85	45	—	—	—
	16	Менск	—5.5	+1.3	2.7	6	—15.6	28	85	65	—22.3	28	27
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	—5.4	+0.5	2.5	10	—	—	85	45	—	—	—
	25	Асіпавічы	—5.1	+0.7	3.3	11	—17.1	28	85	45	—	—	—
	10	Ворша	—7.6	—0.5	2.0	11	—22.4	21	80	55	—22.3	28	28
	19	Горкі	—7.9	—0.4	1.4	3	—22.9	21	85	70	—26.5	28	28
III. Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	—4.7	+0.4	3.5	11	—16.2	28	80	50	—	—	—
	21	Магілеў	—7.1	—0.4	2.8	3	—22.6	21	85	55	—	—	—
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	—7.1	0.0	2.5	3	—20.5	22	—	—	—	—	—
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	—6.2	0.0	2.5	11	—16.8	28	80	50	—	—	—
	32	Жлобін	—5.7	+0.3	3.5	3	—15.5	19	80	50	—	—	—
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	—4.4	+0.5	3.8	11	—15.9	21	85	55	—	—	—
	37	Калінкавічы	—4.9	+0.1	3.5	11	—17.4	19	85	50	—	—	—
	39	Лельчыцы	—4.4	—	3.4	11	—21.2	21	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—6.1	—	—	—	—17.5	27	—	—	—14.5	19	28
	38	Гомель	—5.7	+0.7	3.1	11	—16.4	27	95	75	—	—	—
	35	Васілевічы	—5.2	+0.2	3.3	3	—17.0	19	80	40	—	—	—
	40	Людвінава	—5.3	—0.4	3.4	3	—17.4	19	80	55	—17.7	19	28
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

назіраньняў за люты м-ц 1933 г.

Ападкі ў мм									Вецер		Воблачн. у 10-балавай сыстэме		Інсоляцыя ў %% магчымай	Лік дзён				Сярэдняя вышыня сьнегавога насьцілу за апошнюю дэкаду	
Сума	Норма	Лік дзён з ападкамі							Пераважаючы напрамак	Сярэд. хутк.	Агульная	Ніжняя		Ясных	Пахмурных	З туманам	З мяцеліц.	Сярэдняя	Норма
		≥0.1 мм	≥0.5 „	≥1.0 „	≥2.0 „	≥5.0 „	≥10.0 „	≥20.0 „											
20.8	—	15	12	8	3	1	0	0	S	4.1	7.9	7.2	—	0	17	4	3	18.0	—
48.1	23	18	13	10	7	3	1	0	E	35	8.8	8.1	—	1	21	4.	2	26.9	—
64.5	—	18	11	11	8	5	2	0	—	—	—	—	—	—	—	4	3	37.9	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
50.1	27	12	10	8	7	4	1	0	SE	5.3	8.8	8.2	10	0	21	4	7	43.9	40
—																			
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38.5	23	20	13	11	7	2	0	0	—	—	—	—	—	—	—	4	8	30.4	—
23.2	—	18	14	7	4	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	1	—	22.6	—
46.8	—	22	16	11	8	2	1	0	—	—	—	—	—	—	—	0	2	31.8	—
44.9	29	22	18	10	7	3	1	0	NW	3.8	8.5	7.7	—	0	19	5	3	23.0	—
39.0	37	21	17	13	6	3	0	0	E	3.0	8.9	8.0	—	0	23	8	6	25.8	28
49.0	—	21	14	10	6	3	1	0	—	—	—	—	—	—	—	2	1	22.8	—
15.6	25	11	10	5	4	0	0	0	W	5.9	8.8	8.4	—	0	19	7	0	24.6	19
45.7	—	19	17	11	9	3	0	0	E	3.3	8.2	7.3	—	0	17	9	11	27.2	—
44.2	27	18	13	11	8	3	0	0	E	2.8	8.5	7.1	—	1	20	3	6	29.6	32
47.0	30	18	13	9	7	4	1	0	E	4.6	8.6	8.0	—	1	19	4	13	27.9	40
35.4	—	25	16	10	5	2	1	0	—	—	—	—	—	—	—	1	6	9.4	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
17.5	—	16	9	5	3	0	0	0	W	4.7	—	—	—	1	—	15	3	18.1	—
61.7	30	19	17	15	10	6	1	0	E	3.9	8.6	8.0	—	0	17	4	12	32.4	41
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
68.5	23	22	19	15	7	4	3	0	E	4.5	9.3	8.2	—	0	17	4	4	35.5	—
50.8	—	20	14	9	6	4	2	0	—	—	—	—	—	—	—	3	9	34.6	—
18.3	—	13	10	7	2	1	0	0	E	4.0	8.6	—	—	0	19	1	10	31.1	—
23.2	—	15	13	8	5	0	0	0	E	4.1	8.6	—	—	0	20	5	6	32.8	—
33.5	—	18	11	8	6	2	0	0	W	3.5	8.5	7.4	—	0	18	4	8	21.1	—
29.2	25	17	10	9	5	1	0	0	W	4.4	8.5	7.8	—	0	18	3	10	25.1	21
28.5	—	14	9	7	4	2	0	0	SW	4.0	8.0	—	—	1	17	3	—	—	—
63.3	—	20	15	14	6	3	2	0	—	—	—	—	—	—	—	2	5	32.2	—
32.5	—	15	10	10	7	2	0	0	—	—	—	—	—	0	24	1	7	23.2	—
44.2	—	18	13	9	8	3	1	0	SW	3.3	8.8	8.2	—	1	20	4	7	26.5	27
42.1	30	23	14	9	5	2	1	0	E	4.4	8.6	8.5	13	0	19	2	6	30.6	19
29.6	—	23	14	11	4	1	0	0	E	4.2	8.4	7.9	—	0	19	1	9	15.2	—
18.5	—	12	11	7	3	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	1	9	10.4	—

пейскай тэрыторыі Саюзу, якая спрыяе адыходу халоднага павэтра на ўсход і прасоўваньню за ім з захаду больш цёплага марскога полярнага паветра, якое стварыла веснавое надвор'е апошніх дзён сакавіка.

І. Рачыцкі.

Мэтэоролёгічная характарыстыка за 21—31 сакавіка 1933 г.

Тэмпэратура з пачатку дэкады значна зьнізілася і з 22 па 24 хісталася ад 0 да —4°. 25 наглядаўся ўздым т-ры і 26-га т-ры дасягнулі ўжо 3—5°. Але ў наступны дзень зноў т-ра зьнізілася мясцамі ніжэй 0°. У астатнія дні працягваецца ўздым т-р і к канцу дэкады яны дасягнулі 8—10°. Сярэдняя т-ра за дэкаду хісталася ад 0° да 3°, што на 1-2° вышэй нормальнай. Максымальная т-ра хісталася ад 12 да 16°, мінімальная ад —4 да —7° і наглядалася пераважна 24-га і 25-га.

У дадзеную дэкаду выпала невялікая, а мясцамі і зусім нязначная колькасьць ападкаў. Параўнальна большыя колькасьці, каля 10 мм, выпалі на ўсходзе БССР і ў паўднёвай кліматычнай зоне. Выпадалі яны пераважна ў першыя 2 дні дэкады і потым 28-га і 29-га. Сутачныя колькасьці ападкаў нідзе не перавышалі 5 мм, пераважна-ж былі больш дробныя.

Сьнегавы насьціл зьліквідаваўся поўнасьцю яшчэ спачатку гэтай дэкады.

Пераважаючымі ветрамі спачатку дэкады былі паўночна-ўсходнія, у канцы-ж яны пераходзяць у заходнія і паўднёва-заходнія, у выніку чаго і наглядалася значнае пацяпленьне.

У першыя дні мейсцамі адзначаны туманы, а 24-га слабыя мяцелі.

Н. Малішэўская.

С/г. гідромэтэоролёгічная характарыстыка за дэкаду.

Па дадзеных досьледаў ажыўленьня азімых, азімыя культуры вышлі з -пад сьнегу ў здавальняючым становішчы і адсутнасьць на працягу дэкады рэзкіх хістаньняў мэтэоролёгічных фактараў была спрыяючым для азімых культур.

Раньняя ліквідацыя сьнегавога насьцілу, якая ў параўнаньні з шматгадовымі кліматычнымі дадзенымі па БССР наступіла раней нормы амаль на цэлы месяц, павінна садзейнічаць і раньняму разгортваньню палявых падрыхтоўчых работ, у прыватнасьці разгортваньню звышраньніх пасеваў ільну, які НКЗБ запроектавана на плошчы 1000 га. Выходзячы з умоў мэтэоролёгічнай сытуацыі дадзенай дэкады, звышраньнюю сяўбу па патрабаваньнях агротэхнікі неабходна было скончыць да 25 сакавіка прыблізна.

Нормальная раньняя сяўба зернавых культур па ўмовах надвор'я таксама павінна пачацца значна раней, чымся ў нормальныя гады.

Ф. Рабаконь.

МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за люты мес. 1933 г.

Тэмпэратурны рэжым гэтага месяца меў наступны характар: пачатак месяца адзначаўся высокімі т-рамі, блізкімі да 0°, зьніжэньне пачынаецца з паловы 1-ай дэкады, але т-ра не даходзіць да —10° і з 10-га чысла ізноў падвышаецца прыблізна да —1 і —2°. З 15-га наглядалася зьніжэньне мясцамі да —20°, і нізкія т-ры трымаліся да канца месяца, прычым у паўночна-ўсходняй палове БССР яны хісталіся ад —10° да —20°, а ў паўднёва-заходняй ад —5° да —15°.

У сярэднім за месяц маем т-ру ад —5° да —8°, вельмі блізкую да нормальнай для лютага; адхіленьні маюцца як дадатныя, так і адмоўныя.

Самыя нізкія т-ры наглядаліся ва ўсходняй частцы БССР (Новае-Каралёва, Ворша, Горкі, Магілёў), дзе яны даходзілі амаль да —23°. Самыя высокія т-ры даходзілі амаль да +4° і наглядаліся у розныя дні 1-ай дэкады.

Па выпадзеньню ападкаў магчыма вылучыць усходнюю частку БССР ад лініі Гарадок-Магілёў-Гомель, як найбольш багатую на ападкі (45—65 мм), і заходнюю, з колькасьцю ападкаў 20—45 мм. Нормальна для лютага выпадзеньне 25-30 мм ападкаў.

Выпадалі ападкі пераважна ў першую палову месяца, 2-ое, 6-ое, 10-ае, 13-ае і 14-ае паўсюды адзначыліся значнымі сьнегападамі. Сутачныя колькасьці ападкаў у гэтыя дні шмат дзе перавышалі 10 мм. Другая палова месяца наадварот адзначалася вельмі рэдкімі і нязначнымі ападкамі.

Сьнегавы насьціл, дзякуючы ўстойлівай рэзкай т-ры і даволі значным ападкам, павялічваўся да апошняй дэкады і толькі у апошняй дэкадзе мейсцамі пачаў некалькі зьмяншацца. Максымальныя вялічыні, якіх дасягаў сьнегавы насьціл, хісталіся ад 15 да 40 см, паступова павялічваючыся з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. У сярэднім вышыню сьнегавога насьцілу трэба лічыць нормальнай для гэтага месяца.

Пераважаючымі вятрамі былі ўсходнія, асабліва ў канцы месяца. Сярэдняя хуткасьць умераная, каля 4-5 с/сэк.

Воблачнасьць пераважала вельмі значная, ад 80 да 90% агульнага пакрыцьця неба. Наглядалася вельмі вялікая колькасьць хмарных дзён, у сярэднім 20. Туманы зарэгістраваны ў сярэднім каля 4 разоў.

Вельмі часта наглядаліся мяцелі, асабліва на ўсходзе БССР.

Н. Малішэўская.

Адказны рэдактар **М. Л. Лейвікаў.**

Мінск. Друк. БАН. Заказ № 4377. Гарліт № 1263. Тыр. 1000 экз. 11 стар.